Гарадская грамадска-палітычная газета

Бабруйскае жыццё

Выдаецца з лістапада 1918 года



№№106-107 (15810-15811) ПЯТНІЦА, 14 ліпеня 2000 года. Цана 50 руб.

БЕЛТА інфармуе

Першы этап дыялога завершаны

У рабоце дыялога грамадска-палітычных сіл рэспублікі пакуль яшчэ рана ставіць кропку. І усім магчыма, што ён стане пастаянна дзеючым механізмам узаемаадносін улады і грамадскасці. Аб гэтым заявіў у ходзе пятага пленарнага пасяджэння экспертаў намеснік кіраўніка рабочай групы па правядзенню дыялога памочнік Прэзідэнта Сяргей Посахаў. Цяпер, паведаміў ён, першы этап сумеснай работы грамадска-палітычных сіл ужо завершаны. Адобраныя спецыялістамі праекты паправак да законаў аб сходах, мітынгах, вулічных шэсцях, дэманстрацыях і пікетаванні і аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі будуць накіраваны адпаведным дзяржаўным органам для далейшай дапрацоўкі. А удзельнікаў і экспертаў чакаюць двухмесячныя канікулы. Новы ж этап дыялога, паводле слоў Сяргея Посахава, планууецца ініцыяваць у верасні, да пачатку парламенцкіх выбараў.

Налогавыя заканадаўствы павінны гарманіраваць

Для нас з'яўляецца важнай работа, якая садзейнічала б выкананню праграмы дзеянняў па стварэнню саюзнай дзяржавы, у тым ліку і па уніфікацыі падатковага заканадаўства Беларусі і Расійскай Федэрацыі. Аб гэтым заявіў 7 ліпеня прэм'ер-міністр рэспублікі Уладзімір Ярмошын у ходзе сустрэчы з міністрам па падатках і зборах Расіі Генадзем Букаевым. Уладзімір Ярмошын падкрэсліў зацікаўленасць беларускага боку ў стварэнні такога падатковага заканадаўства, якое будзе гарманіраваць з расійскім. Ён назваў гэта адной з галоўных задач.

У партфелі школьніка – увесь камплект падручнікаў

Да першага верасня ў партфелі школьніка будзе ўвесь камплект падручнікаў. Цяпер са 107 неабходных назваў вучэбнай літаратуры выдадзена ўжо 98. Паводле слоў дырэктара навукова-метадычнага цэнтра вучэбнай кнігі і сродкаў навучання Міністэрства адукацыі Галіны Зносенкі, цяпер цэнтр вырашае сваю галоўную задачу – забяспечыць падрыхтоўчыя класы букварамі, а таксама выпусціць масавы тыраж падручнікаў для другога класа па новай праграме 12-гадова навучання. Упершыню ў гэтым годзе, падзяліла-ся радасцю Галіна Зносенка, убачыць свет буквар для слепых дзяцей.

На дапамогу прыйдзе сямейны ўрач

Навучальны цэнтр па падрыхтоўцы ўрачоў агульнай практыкі будзе створаны ў нашай рэспубліцы. Гэта рашэнне, прынятае на калегіі Міністэрства аховы здароўя, планууецца ажыццявіць ужо ў сакавіку будучага года. Акрамя стварэння навучальнага цэнтра сямейных урачоў, прынята рашэнне ўвесці ў медыцынскіх вучылішчах рэспублікі курс па падрыхтоўцы медсясцёр і фельчараў агульнай практыкі.

16 ЛІПЕНЯ – ДЗЕНЬ МЕТАЛУРГА

У ліцейным цэху машынабудаўнічага завода імя Леніна Іван Сіўчыкаў бадай адзін з самых вопытных вагранщчыкаў.

А пачынаў вучнем фармаўшчыка, калі ў 1986 годзе прыйшоў на прадпрыемства. Старанная малодога рабочага заўважылі, прапанавалі авалодаць больш складанай спецыяльнасцю. І вось амаль дзесяць гадоў Іван Цімафеевіч працуе вагранщчыкам. Добрасумленныя адносіны да справы дазволілі стаць заліўшчыкам высокай кваліфікацыі і якасна выконваць самыя адказныя вытворчыя заданні.

На здымку: вагранщчык Іван Сіўчыкаў.

Аляксандр ФІСЕНКА.



НАКАНУНЕ ВСТУПИТЕЛЬНЫХ ЭКЗАМЕНОВ

Лето не только пора веселых каникул и ровных, спокойных будней для учащейся братии. Кому — отдых, а кому — борьба: упорная, требующая знаний и везения "Фортуны", терпения, борьба за будущую профессию, за право стать студентом того или иного престижного ВУЗа, техникума, колледжа и даже гимназии. И если хоть немного повезет, помогут добытые долгим старательным трудом знания, — то ты студент, у тебя уже определенный статус и хоть туманное, но весьма перспективное будущее.

Как рассказал инспектор по быту ЗМШ Р. В. Сазонов на заводе массовых шин, традиционно, как и на Белорусском шинном комбинате в целом отдельным работникам в этом году даны направления для поступления на заочное обучение в технические и экономические ВУЗы республики. Помимо этого предприятие обучает студентов за свои средства и при успешной их учебе производит оплату сессии согласно среднего заработка.

Всего на ЗМШ в различных технологических и экономических ВУЗах республики сейчас обучается 132 студента. В этом году направления на учебу с гарантией оплаты были выданы 18 работникам ЗМШ.

В Белорусский государственный технологический университет на специальность "Химическая технология производства и переработки органических материалов" направлены 6 человек, в Белорусскую государственную политехническую академию на специальность "Теплоэнергетика" и "Электроэнергетика" — 2 человека, в Могилевский технологический университет на специальность "Автоматизированный электропровод" — 3 человека, "Технология, оборудование и автоматизация машиностроения" — 5 человек. В Бобруйский филиал Белорусского государственного экономического университета будут поступать на специальность "Экономика и управление предприятием" 3 человека.

Будущие студенты успешно прошли заводские и комбинатские комиссии, выполнив требования по стажу работы и другие необходимые составляющие, и уже буквально через две недели приступят к сдаче вступительных экзаменов. Пожелаем им успеха.

Е. ГЛАДКОВА.

В МЕЖРАЙОННОМ КОМИТЕТЕ ГОСКОНТРОЛЯ

НЕ ДОПУСКАТЬ ФОРМАЛИЗМА В РАБОТЕ С ЛЮДЬМИ

В январе-июне 2000 года в Бобруйский межрайонный Комитет государственного контроля Могилевской области с письменными заявлениями обратилось более 230 человек.

Бобруйчан и жителей соседних районов в основном интересовали вопросы, касающиеся работы жилищного хозяйства и улучшения жилищных условий. Таких заявлений поступило 76. Анализ обращений свидетельствует о серьезных недостатках в работе руководителей ряда учреждений и предприятий. Нередко должностные лица, в компетенцию которых входит разрешение поставленных вопросов, допускают формализм в работе с людьми, уклоняются от решения насущных проблем граждан. За нарушение сроков рассмотрения обращений граждан и непринятие должных мер по замечаниям инспектор по обращениям граждан ОЖКХ Ленинского района И. М. Голодюк и начальник ЖЭУ-3 А. Л. Лапухин не так давно были привлечены к дисциплинарной ответственности.

Обоснованное возмущение рабочих вызывают социально неоправданные решения об установлении более высоких ставок первого тарифного разряда для административных и инженерно-технических работников, нарушение законодательства при увольнении с работы, бездействие профсоюзных организаций при рассмотрении трудовых споров, когда вместо принятия конкретных мер людей вынуждают обращаться в инспекцию труда или Комитет госконтроля.

О существенных недоработках руководящих кадров на местах свидетельствуют факты, когда после обращения в Бобруйский МКГК изыскиваются возможности и погашаются долги по заработной плате. Подобные факты имели место в Бобруйском монтажном управлении ОАО "Могилевмонтаж". На момент проверки (23.06.2000 г.) заработная плата не была выплачена еще за апрель. Кроме того, в нарушение п.3 Постановления Совета Министров Республики Беларусь от 24.12.1998 года № 1972 "О дополнительных мерах по совершенствованию оплаты труда работников отраслей экономики" в БМУ было произведено повышение тарифных ставок и должностных окладов при наличии задолженности по заработной плате в апреле 2000 года в 1,3 раза по сравнению с январем 2000 года.

По результатам проверки директор БМУ ОАО "Могилевтехмонтаж" В. С. Корнеев привлечен к административной ответственности.

Были вынуждены обратиться в Бобруйский МКГК и жители деревни Старые Дворяниновичи Павловичского сельского Совета Кировского района с жалобой в вопросах расчета за сданное на ОАО "Кировский маслодельный завод" молоко, ибо их переговоры с местной властью не дали результата. После вмешательства работников МКГК проблема была решена положительно, тем самым было выполнено распоряжение Президента Республики Беларусь о своевременности расчетов с населением за сданное государству молоко.

Подобные действия подрывают доверие населения к органам исполнительной власти, вынуждают граждан обращаться за защитой своих прав и законных интересов в КГК. Об этом свидетельствует тот факт, что каждое второе заявление, поставленное Бобруйским МКГК на контроль, признано обоснованным и разрешено положительно.

В. БУКШИЦ,
специалист Бобруйского межрайонного Комитета государственного контроля Могилевской области.

"ФЕНІКС" ЗНОЙДЗЕ ПРАПІСКУ Ў БАБРУЙСКУ

На чарговым пасяджэнні гарадскога выканаўчага камітэта прынята рашэнне аб стварэнні маладзёжнага шматпрофільнага Цэнтра "Фенікс"– па рабоце з дзецьмі, падлеткамі і моладдзю па месцы жыхарства.

Што будзе ўяўляць сабой "Фенікс", якія задачы стаяць перад ім, чытайце ў бліжэйшых нумарах нашай газеты інтэрв'ю з загадчыкам гарадскога аддзела па справах моладзі Нінай Жураўлёвай.

Внимание: БЛАГОТВОРИТЕЛЬНАЯ АКЦИЯ "Доброе сердце"!

"Каждый ребенок имеет право жить в семье с родителями,которые заботятся о нем". Закон Республики Беларусь "О правах ребенка " (ст. 12).

В жизни случается, когда ребенок остается без родителей. Рушится семья, рушится мир детства. Малыш испытывает глубокое потрясение, горе и страх. Он еще не готов к самостоятельной жизни. Ничто не может заменить ребенку семью, даже самые уютные интернаты и самые добрые воспитатели.

Лето в самом разгаре, но для многих детей, которые воспитываются в учреждениях для детей, оставшихся без попечения родителей, оно мало отличается от других времен года. Эти дети проводят лето в городе – в своих классах и группах.



У всякого человека, имеющего доброе сердце, возникает потребность помочь детям-сиротам. И помочь не сочувствием, а действием, действительно, можно.

Включитесь в городскую акцию "Доброе сердце"! Помогите ребенку-сироте отдохнуть, набраться сил летом в вашей семье. Дети ждут вас, протяните им руку помощи.

Телефоны: **7-37-19 (детский дом № 1), 7-30-78 (спецшкола-интернат № 2), 7-67-30 (приют для несовершеннолетних детей).**

ДВОРНІКІ ПРАВЯЛІ ПІКЕТАВАННЕ

У сераду, у другой палове дня на стадыёне АТ "ФанДОК" з дазволу гарадскіх улад прайшло пікетаванне, арганізаванае па ініцыятыве Г. Пешко, К. Карнейчык і Л. Бокач, што працуюць дворнікамі ў жыллёва-эксплуатацыйных участках №№ 1, 13.

Гэтай акцыяй работнікі ЖЭУ (у першую чаргу рабочыя), прыйшоўшыя ў вызначаны час на стадыён, імкнуліся яшчэ раз засяродзіць увагу кіраўніцтва гарадскога аб'яднання "Бабруйскжылкамгас" на пытаннях, што тычацца павышэння заробкаў і ўмоў працы.

Рэзананс

“ЯК СВАЁ ШАНУЕМ, ТАК І ЖЫВЕМ...”

У нумары "Бабруйскага жыцця" за 7 ліпеня гэтага года быў змешчаны артыкул журналіста газеты Леаніда КУЛЯЎЦА "Як сваё шануем, так і жывем, ці Чаму так надоўга Карл Лібкнехт і Роза Люксембург прапісаліся ў Бабруйску". У артыкуле ішла размова пра тое, што, жывучы на Беларусі, на спрадвечных яе гістарычных землях, беларусы ў сваёй большасці амаль што страцілі сваю нацыянальную адметнасць і найперш – мову, што дадзена кожнаму народу ад яго сцвярджэння ў гэтым свеце, і культуру продкаў.

Асноўным зместам згаданага вышэй артыкула было стаўленне беларусаў да ўсяго свайго – культурнай спадчыны і гістарычнага мінулага, без ведання чаго любы народ, а не толькі беларусы, з годнасцю і гонарам за сваю Бацькаўшчыну жыць не зможа. Адсюль і высновы: як сваё шануем, так і жывем – тыя самыя словы, якія стаяць на першым месцы ў загалоўку таго самага артыкула. І тут вельмі дарэчы яшчэ раз нагадаць словы "Беларусь – наш дом, наш храм, наша Радзіма-маці!", якія былі сказаны Янкам Купалам на зары беларускага адраджэння і на пачатку шляху згуртавання беларусаў як нацыі.

На артыкул "Як сваё шануем, так і жывем..." атрыманы першыя водгукі, якія мы і друкуем.

* * *

Я – БЕЛАРУС! І ГЭТЫМ ГАНАРУСЯ

Прачытаўшы артыкул "Як сваё шануем, так і жывем..." у "Бабруйскім жыцці" за 7 ліпеня, я хачу выказаць асабістыя думкі з гэтае нагоды. Магчыма, атрымаецца гэта не так усебакова, але найперш скажу пра тое, што заўсёды непакоіла і непакоіць зараз. Чаму ж беларусы страцілі сваю нацыянальную годнасць і адметнасць? Каб адказаць на гэтае пытанне, думаю, аднаго газетнага артыкула будзе мала. Таму засяроджу ўвагу чытачоў вось на чым: кожны беларус павінен ганарыцца, што жыве на сваёй зямлі, і абавязаны шанаваць сваю Бацькаўшчыну.

Я нарадзіўся беларусам і гэтым ганаруся. Беларусамі былі мае бацькі, дзяды і прадзеды. Я ўдзячны бацькам за тое, што яны навучылі мяне любіць беларускую мову і родны край. Я ганаруся сваімі продкамі, якія шанавалі Бацькаўшчыну, любілі родную зямельку і стараліся рабіць на ёй так, каб яна заўсёды радзіла і давала поўныя засекі дабра.

Мае продкі заўсёды размаўлялі на роднай мове, што Богам дадзена ім ад нараджэння, насілі прыгожыя строі, вышытыя нацыянальнымі ўзорамі, і перадавалі ўсё гэта наступным пакаленням. Яны гатавалі смачныя беларускія стравы і з радасцю і ўласцівай ім шчырасцю сустракалі гасцей, падаючы прысмакі на стол. Былі тут і чарка, і шкварка, і дранікі, і яешня, і каўбасы, і мядовы настой, прыгатаваны паводле адмысловага рэцэпту.

А якія ткалі посцілкі і ручнікі, якімі ўзорамі іх вышывалі? Глянеш – і воч не адвядзеш. Пры ўсяляках сустрэчах (з іншаземцамі, грамадзянамі суседніх рэспублік) яны ніколі не цураліся сваёй беларускасці, бо лічылі гэта за вялікі грэх.

Што ж мы маем зараз? Што ж мы навылі ці страцілі? Асабліва за некалькі апошніх дзесяцігоддзяў мы страцілі найгалоўную каштоўнасць сваёй нацыі – беларускасць. Калі я, прыкладам, заходжу ў краму і пытаюся там чаго-небудзь па-беларуску, то гандляркі пазіраюць на мяне ці то як на дзівака, ці як на чужынца, ці як на іншапланецяніна. Да таго ж робяць выгляд, быццам бы не разумеюць, чаго ад іх хочуць. Можа б, і не пісаў бы гэтых радкоў, каб не было крыўдна за беларускую мову, каб не было прыкра ад такога незразумелага і нявытлумачанага стаўлення да яе. Чаму літоўцы, латышы, украінцы, палякі і тыя ж расіяне шануюць усё сваё і ганарацца ім? Мы чаму так не робім? Няхай кожны, хто прачытае гэтыя радкі, паспрабуе даць адказ на дадзенае пытанне.

Не буду сцвярджаць, што ўсе беларусы цураюцца сваёй мовы. Пабываўшы ў вяскоўцаў, пахадзіўшы па горадзе, пасустракаўшыся і паразмаўляўшы з людзьмі рознага ўзросту, зрабіў высновы, якія мяне адначасна абнадзеілі і ўзрадавалі. Я заўважыў, што маладыя людзі ў горадзе добра ставяцца да беларускай мовы, прынамсі, больш прыхільна, чым старэйшыя. Некаторыя размаўляюць на ёй, шмат хто з моладзі добра ведае творы беларускіх паэтаў і празаікаў. Такія маладыя людзі (я лічу іх разумнымі) вельмі дасведчаныя, з імі можна размаўляць пра гісторыю і культуру, пра мінулае ўвогуле і сённяшні лёс нашай Бацькаўшчыны.

У горадзе сярод людзей старэйшага пакалення, бадай што, ніхто не адмаўляе, што ён народжаны беларусам, але пацвердзіць сваю беларускасць можа хіба што па пашпарце. А вось у вёсцы амаль усе насельнікі лічаць сябе беларусамі, шануюць сваю мову і размаўляюць на ёй. І тыя астраўкі беларускасці, якія засталіся на Беларусі, усё ж абнадзейваюць, што ўсе мы разам паразумеемся і знойдзем свой шлях да Беларусі – агульнай нашай Радзімы. Калі будзем шанаваць усё сваё роднае і нацыянальнае, тады і нас, беларусаў, больш будуць любіць і паважаць у свеце.

Васіль КАСЦЯН,
інжынер-энергетык.

НЕ ПЛЮЙЦЕ Ў СТУДНЮ...

На мой погляд, артыкул журналіста Леаніда КУЛЯЎЦА "Як сваё шануем, так і жывем..." ("БЖ" за 7 ліпеня) мала каго пакіне абыякавым. Бо гэтая тэма з'яўляецца адной з тых злабадзённых праблем, якія існуюць на Беларусі. Я б не паставіў вышэй за ўсе сённяшнія праблемы, бо любоў да роднай зямлі, да сваёй Бацькаўшчыны не можа ацэньвацца на адным узроўні з нечым іншым вартым таго. А любоў да сваёй зямлі, да Радзімы-маці – гэта не што іншае, як веданне сваёй гісторыі, мовы, культуры і шанаванне ўсяго таго беларускага, што пакаленнямі назапашвалася і перадавалася нашчадкам.

Азірнемся навокал, заўважае аўтар артыкула, і ўслухаемся... Так, беларускай гаворкі мы ў Бабруйску не пачуем (праўда, бываюць і выключэнні), а хіба што ў большасці нейкую моўную блытаніну, якую навукоўцы называюць трасянкай. Я не катэгарычны ў ацэнках моўных здольнасцяў іншых і стаўленні іх да роднай мовы. Але не магу цярпець непавагу да беларускай мовы кшталту: "Вось яшчэ... беларус знайшоўся...". У якой яшчэ дзяржаве можна пачуць такія грэблівыя словы?! У нас часта любяць ва ўсіх выпадках спасылацца на суседку – Расію. Вось яшчэ... рускі знайшоўся... Ці магчыма такое ўявіць у стасунках між людзьмі, што насяляюць абсяг Расійскай Федэрацыі? Тым людзям, якія грэбліва ставяцца да Беларусі і ўвогуле да ўсяго беларускага я б параіў: не плюйце ў студню, бо калі-небудзь узнікне патрэба прыйсці да яе, каб вады напіцца...

Мне вельмі прыйшліся да спадобы словы знакамітага беларускага пісьменніка Францішка Багушэвіча "Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!", якія былі прыведзены ў артыкуле. То чаму б нам не ўвекавечыць памяць аб гэтым чалавеку, аб гэтым змагары за беларушчыну ў назве адной з вуліц Бабруйска. Тым болей для таго ёсць і нагода: сёлета адзначаюцца 160-я ўгодкі Францішка Багушэвіча.

Я згодзен з аўтарам артыкула наконт сцвярджэння: як сваё шануем, так і жывем. Сапраўды, чаму ў назвах вуліц (ды і не толькі вуліц) пераважаюць імёны нямецкіх, італьянскіх, рускіх ды іншых рэвалюцыянераў, а знакамітым беларусам, змагарам за Бацькаўшчыну месца амаль не знаходзіцца. А колькі паэтаў, пісьменнікаў, дзяржаўных дзеячоў Беларусі згінула ў гады рэпрэсій, асабліва пры канцы 30-х гадоў? Сярод іх, прыкладам, і ўраджэнец Бабруйшчыны пісьменнік Платон Галавач, і паэт Валерый Маракоў, які ў 30-я гады жыў у Бабруйску.

Пры канцы выказвання сваёй думкі наконт праблем, узнятых у артыкуле "Як сваё шануем, так і жывем...", спашлюся на словы аўтара, што патрэбна "... пісьменна і кваліфікавана валодаць беларускай мовай. А гэта немагчыма без аднаўлення навучання беларускай мове ва ўсіх дзіцячых дашкольных установах, без пашырэння праграмы яе вывучэння ў школах, гімназіях, а таксама ў тэхнікумах і ВНУ".

Яшчэ не ўсё страчана, у нас ёсць усе магчымасці для таго, каб звацца беларусамі не толькі паводле пашпарта.

Васіль КАТЛЯРЭНКА,
доктар-уролаг.

АД АЎТАРА АРТЫКУЛА

Вы, паважаныя чытачы, толькі што прачыталі водзывы на мой артыкул "Як сваё шануем, так і жывем...". Думкі абодвух аўтараў супадаюць, хоць і маюць розныя накірункі. Я спадзяюся, што сярод нашых чытачоў і падпісчыкаў яшчэ знойдуцца людзі, якім неабыякава дадзеная тэма і якія захочуць выказацца па ёй.А я, працягваючы размову, хачу пазнаёміць вас з некаторымі эпізодамі з майго жыцця, што звязаны з моўнымі стасункамі.- Мне, як чалавеку, які размаўляе па-беларуску, даволі часта задаюць амаль што адны і тыя ж пытанні: "Вы выкладчык беларускай мовы?", "Вы з БНФ?", "Як вы размаўляеце дома?". У такім разе задаю свае пытанні: "Запытайцеся ў немца, паляка ці расіяніна, калі яны размаўляюць на роднай мове, то яны ўсе настаўнікі, усе ўступілі ў партыі?". А каб нехта з нашых запытаўся як немец альбо рускі размаўляе дома, то яго, прынамсі, палічылі б адсталым на розум.

Мне, у прыватнасці, на базары, даводзіцца чуць і такое: беларускі мужчына купіце ў нас што-небудзь... Хіба пытанні такога кшталту могуць быць зададзены грамадзянамі суседніх дзяржаў сваім суайчыннікам? Калі я бываю ў Польшчы ці ў Расіі, то там гэтакіх пытанняў не задаюць. Расіяне адразу бачаць ува мне беларуса і не дзівяцца маёй гаворцы.І, дарэчы, усё разумеюць. А палякі – з нагоды блізкасці нашых моў – нярэдка робяць мне кампліменты: пан добра размаўляе па-польску!

Я літаральна некалькі дзён таму вярнуўся з прыватнай паездкі ў Маскву. У размовах з масквічамі пераходзіў на беларускую мову, і гэта ўспрымалася як мае быць. Дарэчы, руская ў большасці прыязна ставяцца да беларусаў.

Звярнуў увагу і на назвы маскоўскіх вуліц. Ідзе (больш чым за тыдзень аб'ездзіў горад уздоўж і ўпоперак) я не ўбачыў у назвах вуліц імёнаў нават рускіх рэвалюцыянераў перыяду Кастрычніцкай рэвалюцыі, а не тое што нямецкіх ці італьянскіх. Там аднаўлены гістарычныя назвы вуліц, праспектаў і станцый метро. На ўскрайках цяперашняй Масквы, дзе даўней былі вёскі ці маёнткі знакамітых людзей Расіі, размясціліся буйныя мікрараёны з усёй сучаснай інфраструктурай. Мікрараёны, вуліцы, праспекты і станцыі метро атрымалі імёны вядомых людзей, якія жылі там, альбо – па назве мясцовасці альбо вёскі. Аналізуючы ўсё гэта, я зрабіў выснову, што Масква вярнулася да гістарычных каранёў. Такой жа думкі прытрымліваюцца і масквічы, з якімі давялося мець размову.

У Нарвегіі мне быць не давялося, але добра ведаю пра адну акалічнасць, звязаную з нарвежскай мовай. Пасля атрымання гэтай краінай незалежнасці ад Швецыі нарвежцы не мелі нават і таго, што мы сёння маем. Іх мова захавалася тады толькі на астравах, што належаць гэтай краіне. Туды і паехалі навукоўцы ды іншыя разумныя і адукаваныя людзі.З дапамогай тутэйшых жыхароў яны вывучылі родную мову і прывезлі яе найперш у школы ды навучальныя ўстановы. Вось так і аднавілі тое, што, здавалася, было ўжо страчана незваротна.

Леанід КУЛЯВЕЦ.

Служба информации "БЖ"

В СТРАХОВОЙ ПОЛИС ВНЕСЕНЫ ИЗМЕНЕНИЯ

Не так давно внесены изменения в правила обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств. Если можно, расскажите об этом более подробно.

Р. КАЦНЕЛЬСОН,
автолюбитель.

За разъяснениями редакция обратилась к заместителю директора отделения Белгосстраха г. Бобруйска Т. В. ЧИСЛОВОЙ.

Вот что она сообщила:

С 1 июля 2000 года продолжается переоформление и заключение договоров гражданской ответственности владельцев средств транспорта. Согласно Указа Президента от 12 июня 2000 г. за № 339 "О совершенствовании порядка и условий проведения обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств" произошли некоторые изменения.

Изменились лимиты ответственности за вред, причиненный в результате дорожно-транспортных происшествий, в сторону их увеличения, введены корректирующие коэффициенты в отношении резидентов Республики Беларусь.

Договор страхования заключается на один год. При сезонном использовании транспортных средств договор страхования заключается на срок от одного до двенадцати месяцев. По вновь заключенным договорам договор страхования вступает в силу с момента уплаты страхового взноса или его части.

При безналичном расчете моментом уплаты считается поступление денежных средств на счет страховщика.

Страховое свидетельство (страховой полис) выдается страхователю одновременно с уплатой наличными деньгами страхового взноса или его части, при уплате путем безналичного расчета – в 10-дневный срок.

Перезаключение договора страхования осуществляется не ранее, чем за 30 дней до даты истечения действующего договора страхования.

При использовании транспортного средства в дорожном движении без договора страхования на владельца налагается штраф в установленном порядке.

По всем возникающим вопросам, касающимся обязательного страхования гражданской ответственности владельцев транспортных средств обращаться по телефонам: 7-78-55, 7-66-87 или по адресу: ул. Пушкина, 251.

ЯК АЧЫСЦІЦЬ ПРАДУКТЫ АД РАДЫЁНУКЛІДАЎ

Забруджанае радыёнуклідамі **мяса** пасля адтайвання (замарожваць абавязкова) рэжуць на кавалкі і замочваюць у салевы раствор, у які дабаўлена 70-працэнтная воцатная эсэнцыя. Суадносіны мяса і раствору – 1:2. Раствор мяняюць праз кожныя 3-6 гадзін.

Такім чынам удаецца знізіць канцэнтрацыю цэзію больш чым у 300 разоў. Можна воцат замяніць аскарбінавай кіслатой – адзін грам на літр вады. Наяўнасць у растворы арганічных кіслот перашкаджае вымыванню бялкоў. Апрача таго, з'яўляючыся кансервантам, яны прадухіляюць псаванне прадукту.

Радыёнукліды з **саланіны** выводзяць, замачыўшы яе ў халоднай водаправоднай вадзе, якую мяняюць праз кожныя тры гадзіны. Пры варцы саланіны да гатоўнасці канцэнтрацыя радыёнуклідаў зніжаецца яшчэ ў два разы.

Калі варыць **моркву** ў падсоленай вадзе, колькасць радыёнуклідаў зніжаецца ў 7,3 раза.

Вымочванне абабраных ад лупін клубняў **бульбы** ў падсоленай вадзе 3-4 гадзіны зніжае ў іх канцэнтрацыю радыёнуклідаў да 40 працэнтаў. Пры варцы бульбы ў падсоленай вадзе да гатоўнасці канцэнтрацыя цэзію – 134-137 зніжаецца ў 2,5 раза.

Калі ў працэсе варкі ваду змяніць адзін раз, то канцэнтрацыя знізіцца ў 4,4 раза.

Тушкі прэснаводных **рыб** замочваюць у растворы харчовай солі – 30-40 грамаў на літр вады. Раствор мяняюць праз кожныя паўтары гадзіны. Пасля трох гадзін вымочвання выводзіцца да 65 працэнтаў радыёнуклідаў.

Грыбы выпарваюць у солевым растворы – 30 грамаў харчовай солі на літр вады. Раствор мяняюць праз кожныя 10-20 хвілін. Агульны час кіпення – 50 хвілін. Перад кожнай заменай раствору грыбы адкідваюць на друшляк і прамываюць вадой. Выводзіцца каля 99,9 працэнта радыёнуклідаў. Такім спосабам можна ачысціць і сушаныя грыбы, папярэдне размачыўшы іх у вадзе.

МОРСКОЕ ДНО УСЕЯНО ЗАТОНУВШИМИ КОРАБЛЯМИ

С удовольствием всей семьей смотрим по телевидению подводную киноэпопею Жака-Ива Кусто, особенно кадры о затонувших кораблях. А известно ли, хотя бы приблизительно, сколько погибших судов лежит на дне океанов и морей?

Л.ОРЕХОВА.

По подсчетам американских океанографов Рехнитдера и Тарри – не менее одного миллиона. С начала века до наших дней каждый год в среднем погибало по 398 судов, а ежегодные потери в середине XIX века составляли около 3 тысяч судов. Если считать, что судоходством люди занимаются не менее 2 тысяч лет, и принять, что ежегодная средняя потеря судов составляла 500 единиц, то и получится упомянутый миллион погибших судов. Таким образом, на каждые 40 кв.км. площади дна морей и океанов приходится в среднем одно утонувшее судно.

ЮБИЛЕЙ ВОЕННОГО СКЛАДА

Торжественное собрание, посвященное 55-летнему юбилею со дня формирования части, проходит сегодня с личным составом 393—го военного склада, которым командует подполковник В. Шишко.

Образованный в соответствии с директивой Главного штаба ВС СССР № ОРГ/1/151 ОВ от 11 июля 1945 года, за свою многолетнюю деятельность коллектив склада успешно справлялся со всеми поставленными перед ним задачами по бесперебойному и качественному обеспечению войск продовольствием, техникой и имуществом продовольственной службы, проявил высокую профессиональную выучку в ходе проведенных с ним тактико-специальных учений в мае текущего года.

В приказе заместителя министра обороны по тылу – начальника тыла Вооруженных Сил Республики Беларусь генерал-майора А. Христофорова, посвященном этой знаменательной дате, отмечен большой вклад личного состава части в обеспечение сохранности запасов продовольствия и материальных средств, поддержание хранилищ и холодильных установок в исправном состоянии.

Прежде всего в этом немалая заслуга майора В. Ждановича, капитана В. Свирщева, служащих ВС С. Петрушенко, С. Петровской, М. Жевнеровича, В. Сухорукова, а также ветеранов склада Г. Недобитой, Р. Валько, И. Сакуна, В. Рассохи и многих других, отмеченных в праздничных приказах.

В. ФИЛОНОВ.

ВЕЛИКИЙ СЛЕПОЙ



Как бы не было велико искусство перевоплощения Михаила Самуиловича Паниковского, но, согласитесь, оно ничто по сравнению с искусством жить без света...

О существовании этого необычного болельщика, о котором пойдет речь далее, мне рассказали друзья. Нет, слов, "необычный" не совсем подходит к этому человеку. Скорее —"удивительный". Я несколько матчей "Белшины" подкарауливал его у ворот стадиона "Спартак". Все тщетно. Приметы? Я знал лишь одно – он слепой...

Перед матчем "Белшина"—"Днепр" мы столкнулись с ним нос к носу. Оказывается, я ранее с ним встречался, но не мог и подумать, что он не видит... Мы познакомились, поговорили о том о сем. И конечно, вскоре перешли к футболу. Выяснилось, что 38-летний Николай Кулешов "болеет" за "Белшину" уже целую пятилетку, среди "шинников" ему импонирует игра Дениса Королика и Эдуарда Болтрушевича: "За Болтрушевича я "болею" еще с тех пор, когда он играл за витебскую "Двину". Очень хороший игрок, надежный. Я был безмерно рад, узнав, что Эдик "переплыл" из "Днепра" к нам. Я-то сам родился в Жлобине, долго жил в Орше. Там-то Болтрушевича и запримечтил. Сейчас живу в Бобруйске, исходил город вдоль и поперек. Я, честное слово, могу найти дорогу без провожатых с "Общества" до "Спартака". Не веришь – давай поспорим... Одно плохо, что милиция иногда не пускает на стадион. Но я не обижаюсь. Кстати, у меня к тебе огромная просьба – познакомь с Болтрушевичем. Это моя давняя и пока не сбывшаяся мечта." Просьба Николая для меня не осуществимой не показалась, что не сделаешь для такого фэна. Раздобыли футболку "Белшины", срочно вызвали из раздевалки Эдика и сфотографировались на память. Пообщались. Чуть позже к нашей компании примкнул вице-президент клуба Олег Гуща.

—Да ради такого болельщика можно выиграть и Лигу чемпионов, – сказал он и подарил Николаю клубный шарф. Вот такой хеппи-енд.

PS. Да, чуть не забыл. Бобруйчане! Когда покупаете электротовары, розетки там всякие, удлинители, не поленитесь поинтересоваться, чье производство. Если бобруйского УПП "Белтис", то купите побольше. Пусть будет про запас, потому что, возможно, эту вещь сделал своими руками "Великий слепой" Николай – человек, на всю жизнь влюбленный в футбол. Да и просто хороший парень.

Валерий АЛЕКСЕЕВ.

На снимке: *Николай Кулешов (слева) и защитник "Белшины" Эдуард Болтрушевич.*

Фото: А. Фисенко.

НЯРОЎНЫ "БОЙ" У НЯСВІЖЫ

Пазаўчора на розных стадыёнах нашай краіны прайшлі кубкавыя матчы сярод футбольных каманд вышэйшай лігі.

У 1/16 розыгрышу Кубка Беларусі наша "Белшына" сустракалася на выездзе у Нясвіжы з мясцовай камандай "Верас" з 1-й лігі. Зыход гэтага матча – 8:2 на карысць бабруйчан. Галы ў вароты гаспадароў поля забілі – С. Дзямідчык (3), В. Ланько (2) і па аднаму мячу на рахунку І. Беляя, В. Азарава і Э. Балтрушэвіча.

У перадапошнім туры першага круга чэмпіянату краіны, што адбудзецца паслязаўтра, "Белшына" памераецца сіламі з рэчыцкім "Ведрычам". Гэты матч, пачатак якога ў 18.00, пройдзе на стадыёне "Спартак".

А. НІКАЛАЕЎ.

Языком цифр

КАЖДЫЙ ЧЕТВЕРТЫЙ НЕ ДОЖИВЕТ ДО ПЕНСИИ?

Согласно рейтингу, представленному в Глобальном отчете Программы развития ООН за 2000 год, Беларусь занимает 57-е место в списке 174 стран по индексу человеческого развития – показателю, который отражает достижения каждой страны в области долголетия населения, повышения уровня его образования и обеспечения достойного качества жизни.

Из бывших республик Советского Союза по индексу человеческого развития Беларусь опережают только Эстония (46-е место и Литва (52-е); Россия занимает 64 -е место, Латвия – 63-е, Казахстан – 73-е, Украина – 78-е, Таджикистан – 110-е место. В то же время Беларусь входит в число 22 стран, в которых абсолютный показатель индекса человеческого развития снизился за период с 1990 по 1998 год.

● Пока наша республика занимает одну из верхних строчек в рейтинге "Страны со средним уровнем развития человеческого потенциала", куда вошло 93 государства. Высокого же уровня удостоены всего 46 стран. Лидирует в этом списке Канада. А вот печальное 174-е (последнее) место занимает страна с самым низким уровнем развития человеческого потенциала– Сьерра-Леоне.

● Средний доход 20 % наиболее обеспеченных граждан Беларуси менее чем в три раза превышает средний доход 20 % самых бедных ее граждан. По этому показателю "равномерности распределения общественного дохода между всеми членами общества" Беларусь находится на втором месте в регионе СНГ и Восточной Европы, незначительно уступая только Словакии. При этом реализация права белорусских граждан на достойный уровень жизни по-прежнему остается чрезвычайно актуальной задачей. Доходы почти половины белорусов не превышают 2/3 минимального потребительского бюджета.

● В 1994 году в Беларуси было зарегистрировано 1.161 преступление на 100 тысяч населения (средний показатель по странам СНГ составляет около 870 зарегистрированных преступлений на 100 тыс. населения). Наименьшее количество преступлений на душу населения регистрируется в Сирии (16 на 100 тыс.), Египте (36), на Мадагаскаре (75), в Индонезии (80) и Филиппинах (139), тогда как в Канаде – 9.982, Дании – 10.508, Швеции - 12.671.

По количеству заключенных на душу населения Беларусь входит в тройку мировых лидеров – 477 на 100 тысяч населения. Первое место занимает Россия – 580 заключенных на 100 тыс. населения; на втором – США (554).

● Несмотря на достаточно низкий уровень младенческой смертности (22 случая на 1.000 живорожденций), Беларусь, по данным ПРООН, является единственной страной в мире, в которой этот показатель не изменился по сравнению с 1970 годом. За исключением Армении и Ирака, в которых младенческая смертность увеличилась, все остальные государства мира добились уменьшения этого показателя. В наиболее развитых странах он составляет 4-8 случаев на 1.000 живорождений.

Однако Беларусь занимает 10-е место в мире по количеству врачей на душу населения (379 на 100 тысяч) и 6-е место – по количеству медсестер (1.160 на 100 тысяч).

Каждый четвертый гражданин Беларуси, родившийся в 1998 году, не доживет до 60 лет. Беларусь входит в число 17 стран мира, в которых к 2015 году население уменьшится. В 1996 году в Беларуси на каждые 100 браков было зарегистрировано 68 разводов (второе место в СНГ и Восточной Европе после Эстонии).

● Если по количеству телефонов на душу населения Беларусь занимает первое место в СНГ (241 на 1.000 человек), то мобильными телефонами в Беларуси пользуется только один человек из тысячи (на Украине – 3, в России – 5, Эстонии – 170, Японии – 374, Финляндии – 891).

(По материалам Представительства ООН в Беларуси).

Во саду ли, в огороде

В июле яблоки упали

Еще не время собирать урожай яблок, а они уж сами падают с деревьев. В чем же дело?

Причин может быть несколько. И самая очевидная– это грибное заболевание яблонь– монилиоз (плодовая гниль).

Споры гриба проникают под кожицу яблок через маленькие трещинки. Мякоть яблока начинает гнить, и плод не удерживается на ветке. Если стоит сухая прохладная погода, спороношение приостанавливается, но яблоки мумифицируются, чернеют. Они остаются висеть на деревьях и зимой, сохраняя внутри себя возбудителя монилиоза. Такие " мумии " – основной источник инфекции в будущем сезоне. Поэтому, заметив следы поражения яблок плодовой гнилью, необходимо собрать все опавшие плоды, оборвать мумифицированные и обязательно сжечь. В компостные ямы их закладывать нельзя. Некоторые в целях экономии срезают гниль, а то, что осталось, пускают в переработку. И не подозревают, что очень вредят своему здоровью. **Возбудители плодовой гнили опасны для человека, они вызывают онкологические заболевания.**

Чтобы монилиоз не сгубил весь урожай, деревья надо опрыскать поликарбацином или полихомом – 40 г на 10 л воды. Второе опрыскивание проводят через две недели. А последнее – не позднее чем за 20 дней до сбора урожая. Из растительных препаратов хорошо помогают настои лука, чеснока, календулы. Ими можно опрыскивать растения без ограничений.

Но бывает так: плоды вроде бы не больны, а все равно опадают. Причина в том, что дереву не хватает калия. **Восполнить его недостаток поможет внекорневая подкормка минеральными калийными удобрениями или настоем золы. Готовят настой так: стакан золы разводят в ведре воды и настаивают 8 часов. Затем этим настоем надо опрыснуть крону яблони по периферии, но ни в коем случае не сам ствол и не под корень. Норма расхода на дерево в возрасте 15- ти лет – 7 ведер, 20 лет – 12, старше – 10- 16 ведер. За сезон желательно делать не менее трех внекорневых подкормок: весной– перед началом цветения, летом– когда плоды размером с грецкий орех, осенью – во время подготовки дерева к зиме.**

Огурцы уже цветут, а завязи нет

Нужно присмотреться, есть ли на растении женские цветки (маленький огурчик с желтым цветком). Только они дают плоды. А все цветки без огурчика – пустые. Это мужские, и от них не ждите урожая.

Вторая причина – низкая влажность воздуха. Пыльца становится стерильной.

Третья беда – нет пчел, ос, шмелей. Перелетая с цветка на цветок, они на лапках, животике, других частях тела переносят липкую пыльцу. Достаточно прикосновения к сердечку женского цветка, чтобы " пошел процесс жизни ". Лучше всего это происходит при температуре в 18-20 градусов.

Операцию по опылению можно организовать самим, если пчелы не нашли еще хорошего медоноса. Сорвите пустоцвет, оборвите лепестки, прикоснитесь жалом к центру женского цветка. Завязь развивается довольно быстро. Уже на четвертый- пятый день виден рост огурца. Обычно на 12-й день можно снимать плод. Если оплодотворения не произошло, женский цветок-огурчик желтеет и в конце концов отпадает или загнивает. В период массового цветения, полива и роста плодов очень важно давать **раз в неделю подкормки. Можно коровяком (1: 10 или 1: 15) с добавлением на ведро 15 г мочевины.** Вечером делайте душ для листьев. " Душ " делают настоенной на солнце водой распылителем или веничком.

Ждать долго не заставит фитофтора

До 20 болезней угрожают нашим картофельным плантациям. Наиболее опасная из них – фитофтороза.

Уже в начале июля, после того как наступит фаза бутонизации, особенно при влажной погоде, на картофеле, по краям долек листьев, нередко появляются круглые коричневые пятна. Как показывает многолетняя практика, если в этот период стоит сухая погода, прогрессирование болезни не происходит. Если же проходят дожди, выпадают росы, количество пятен быстро увеличивается, в короткое время ботва может превратиться в сплошную гнилую массу. Это значит – картофель повредила фитофтора. За 3-4 дня могут погибнуть все посадки картофеля.

Чтобы упредить появление этой болезни, растения, достигшие 15-20 сантиметров, опрыскивают 1-процентным раствором чеснока, лука, редьки, тополя, черемухи. Раствор приготовить несложно: 10 грамм массы заливают 1 литром воды, настаивают 8 часов, процеживают. Можно использовать также настой из листьев березы (100-150 грамм залить 1 литром воды). Опрыскивают такими растворами картофель через каждые 10-12 дней.

На приусадебных и дачных участках для профилактики опытные картофелеводы проводят опрыскивание бордоской жидкостью. Если после такой процедуры голубой цвет листвы остается долгое время, фитофторы не будет. **Хороший эффект дает опрыскивание картофеля (раз в неделю)** слабым раствором медного купороса (1 ч. ложка на ведро воды), хлорокиси (концентрация такая же), поликарбоцина (40 г на 10 л воды).

Рекомендуется также двукратное окучивание перед смыканием ботвы. Это предохранит клубни от проникновения болезни с ботвы.

Необходимо сбалансированное применение удобрений с преобладанием фосфорно-калийных. Нельзя допускать внесения избытка азотных минеральных удобрений (мочевины, аммиачной селитры).

Одинаково ли реагируют разные растения на кислотность почвы?

На кислотность почвы садовые, овощные и другие растения реагируют по- разному. По отношению к кислотности почвенного раствора их можно разделить на 4 условных группы:

ПЕРВАЯ– растения, которые не переносят кислых почв и требуют нейтральной или слабощелочной почвенной среды (капуста всех видов, свекла столовая, смородина черная, красная и белая, укроп, астры, розы, хризантемы, левкои, агератум).

ВТОРАЯ– растения, нуждающиеся в слабокислой и близкой к нейтральной реакции (яблоня, слива, вишня, фасоль, горох, бобы, брюква, огурцы, лук, чеснок, шиповник, колокольчик, примула и др.).

ТРЕТЬЯ– растения, переносящие умеренную кислотность (малина, груша, земляника, крыжовник, репа, редька, редис, морковь, тыква, кабачки, помидоры, папоротники).

ЧЕТВЕРТАЯ– растения, переносящие повышенную кислотность (щавель, картофель, гортензия и др.).

Свежие огурцы к новогоднему столу

Как сохранить огурцы свежими до нового года ? Оказывается, сделать это вовсе несложно. Вот только вырастить их надо... в капусте.

А технология такова. Завязавшийся огурец, не срывая с плети, помещают в формирующийся на грядке капустный кочан. Плод огурца развивается внутри кочана и, когда вырастет, отщипывается от огуречной плети. Капустные листья кочана плотно укутывают огурец, создавая ему таким образом индивидуальное хранилище. **Вызревший кочан капусты с огурцом внутри срезают с частью кочерыжки и хранят в погребе или подвале. Капуста для этого эксперимента должна быть поздних лежких сортов с плотными кочанами.**

Здоровье

НАЙДЕНО СРЕДСТВО ОТ СТАРЕНИЯ

Чудесной способностью побеждать старость обладают... ягоды черники. Американский ученый из Бостона Дж. Джозеф, ведущий специалист по проблемам старения, выступая с докладом на международной конференции по выращиванию фруктов и овощей, проходившей в Новой Зеландии, сообщил, что лабораторные исследования, проведенные им, доказали: насыщенная черникой диета эффективна против таких симптомов старения, как потеря памяти, мускульной силы, зрения и нарушение координации движений.

Приметы

ПОНЕМНОГУ ОБО ВСЕМ

● Тринадцатый человек за стол не садится.

● Свежие розы отдают человеку много целебной энергии, но как только появились признаки увядания, цветы необходимо без промедления выбросить.

● Если в комнате быстро вянут цветы, особенно розы, у живущего там человека – острая нехватка энергии, связанная с болезнью или порчей. Тяжелая, напряженная эмоциональная обстановка также способствует быстрому увяданию цветов.

● Если вы прикусили язык, значит кто-то в этот момент вас ругает. Необходимо произнести: "Добром – так вспомни, а злом – так полно".

● Не покупайте машину, которая часто попадала в аварии.

ПАМЯЦЬ ПРАЗ ГАДЫ

Творчасць выдатнага беларускага празаіка, драматурга, публіцыста Кузьмы Чорнага адметнай рысай вылучаецца ў скарбонцы нашай нацыянальнай літаратуры. Нарадзіўся ён сто гадоў таму на Случчыне. Вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. У 1920-22 гадах – сакратар валаснога рэўкома, настаўнік у Цімкавічах,справавод Слуцкага павятовага ваенкамата. Потым вучыўся на літаратурным аддзяленні педагагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. А з 1923 года ўвесь далейшы і творчы шлях Кузьмы Чорнага быў звязаны з газетнай і літаратурнай працай, хаця пачаў друкавацца яшчэ ў 1921 годзе.

